# ПАМЯТКА ПА РАБОЦЕ НАД ПАМЫЛКАМІ
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

**1. ПРОПУСК, ЗАМЕНА ЛІТАР.**

Напішы слова правільна, падкрэслі літару, пастаў націск, запішы гэта слова яшчэ раз, падзяляючы яго на склады.

Рабі так: **Малíна, ма/лі/на.**

**2. ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ Ў КАНЦЫ СКАЗА.**

Напішы сказ, пастаў патрэбны знак, падкрэслі яго. Запішы яшчэ адзін сказ з такім знакам.

Рабі так: **Прыляцела ластаўка. Прашумела навальніца.**
**Якая прыгажосць! Гэта ж вавёрка!**

**Запомні!** У канцы сказа ставіцца кропка(.), пытальнік(?) ці клічнік(!). Выбар знака прыпынку залежыць ад сэнсу сказа і інтанацыі, з якой ён вымаўляецца.

**3. ВЯЛІКАЯ ЛІТАРА Ў ПАЧАТКУ СКАЗА.**

Напішы сказ правільна, прыдумай і запішы яшчэ 1 сказ, падкрэслі вялікую літару.

Рабі так: **Узняўся вецер. Паліў дождж.**

**Запомні!** Першае слова ў сказе пішацца з вялікай літары.

**4. ВЯЛІКАЯ ЛІТАРА Ў СЛОВАХ.**

Напішы слова правільна, запішы яшчэ 2 слова на гэта правіла, падкрэслі вялікую літару.

Рабі так: **Васіль, Вольга, Янка.** Або: **Нёман, Днепр, Свіслач.**

**Запомні!** Імёны, імёны па бацьку, прозвішчы, мянушкі жывёл, назвы краін, гарадоў, вёсак, вуліц, рэк, азёр, мораў пішуцца з вялікай літары.

**5. ПЕРАНОС СЛОЎ.**

Напішы слова правільна, падзяляючы яго для пераносу. Запішы яшчэ 3 словы.

Рабі так: **Асі-на, сяб-роў-ка, лі-лея, агу-рок.**

**Запомні!** Словы трэба пераносіць па складах. Адну літару нельга пакідаць на радку ці пераносіць на другі радок: **пяю, юнак**.

Літары **й, ў, ь** пры пераносе нельга аддзяляць ад папярэдняй літары: **пай-шлі, роў-ны.**

Пры пераносе слоў з падвоенымі літарамі адна застаецца на радку, а другая пераносіцца: **калос-се, гал-лё**.

Пры пераносе слоў літары **дз, дж** падзяляць нельга: **сту-дзень, ся-джу**.

**6. СЛОЎНІКАВЫЯ СЛОВЫ.**

Запішы слова правільна, пастаў націск, запішы яшчэ раз, падзяляючы на склады, падкрэслі літару, якую трэба запомніць.

Рабі так: **Медáль, ме/даль.**

**Запомні!** Напісанне гэтых слоў трэба запомніць ці паглядзець у слоўніку.

**7. ПРАВАПІС Ў.**

Напішы слова або словазлучэнне правільна, запішы яшчэ 2 слова на гэта правіла, падкрэслі галосную перад ў і саму ў.

Рабі так: **Малюваў, чытаў, дрэўца.** Або: **Жыве ў лесе, хацелася ўбачыць**.

**Запомні!** Літара **ў** (у нескладовае) пішацца заўсёды пасля галосных у сярэдзіне слова, і ў канцы, а ў пачатку, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосную.
Пасля знакаў прыпынку літара ў не пішацца, а пішацца у.
Літара ў не бывае вялікай: вуліца Усходняя, балерына Уланава.

**8. ПРАВАПІС ГАЛОСНЫХ О, Э, А.**

Напішы слова правільна. Запішы, ад якога слова яно ўтварылася, пастаў націскі. Запішы яшчэ 2 пары слоў на гэта правіла.

Рабі так: **Дамы-до́м, гарады-го́рад, бары-бо́р.** Або: **Рака́-рэкі, цана́-цэны**.

**Запомні!** У беларускай мове галосныя **о, э** могуць быць толькі пад націскам, не пад націскам замест іх пішацца літара **а**.
**Словы-выключэнні:** тэлегра́ма, дэта́ль, о́рдэн, гардэро́б, флама́стар, тэлеві́зар і інш.

**9. ПРАВАПІС ГАЛОСНЫХ Е, Ё, Я.**

Напішы слова правільна, пастаў яго ў множным ліку, абазнач націск, запішы яшчэ 2 словы на гэта правіла.

Рабі так: **Сяло́ – сёлы, вярба́ – ве́рбы, зямля – зе́млі.**

**Запомні!** У беларускай мове замест літар **е, ё** ў першым складзе перад націскам пішацца **я**.
**Словы-выключэнні**: меда́ль, метро́, леге́нда, пена́л, спекта́кль, мело́дыя, геро́й і інш.

**10. ПАРНЫЯ ЗВОНКІЯ І ГЛУХІЯ ЗЫЧНЫЯ.**

Напішы слова правільна, падбяры праверачнае. Запішы яшчэ 2 словы на гэта правіла.

Рабі так: **Грыб – грыбы, плод – плады, нізкі – нізенькі**.

**Запомні!** Напісанне слоў з парнымі зычнымі на канцы слова і перад глухімі зычнымі трэба правяраць. Трэба падабраць праверачнае слова, каб пасля зычнай стаяла галосная.
Звонкія і глухія зычныя ўтвараюць наступныя пары: **б-п, г-х, д-т, дз-ц, дж-ч, ж-ш, з-с**.

**11. АБАЗНАЧЭННЕ МЯККАСЦІ ЗЫЧНЫХ НА ПІСЬМЕ МЯККІМ ЗНАКАМ.**

Напішы слова правільна, запішы яшчэ 2 словы на гэта правіла, падкрэслі зычную з ь.

Рабі так: **Вугаль, рысь, канькі.**

**Запомні!** Мяккасць зычных на пісьме абазначаецца **ь**, а таксама літарамі **е,ё,ю,я,і**.

**12. ЗЫЧНЫЯ Б, П, М, Ф НА КАНЦЫ СЛОЎ.**

Напішы слова правільна, запішы яшчы 2 словы на гэта правіла, падкрэслі зычную.

Рабі так: **Глыб, восем, россып.**

**Запомні!** Зычныя **б, п, м, ф** на канцы слоў заўсёды вымаўляюцца **цвёрда**, таму на пісьме мяккі знак пасля іх не ставіцца.

**13. ЗЫЧНЫЯ Ж, ДЖ, Ч, Ш, Р І ГАЛОСНЫЯ ПАСЛЯ ІХ.**

Напішы слова правільна, запішы яшчэ 2 словы на гэта правіла, падкрэслі зычную разам з галоснай.

Рабі так: **Вожык, жалеза, жоўты.**

**Запомні!** Зычныя ж, дж, ч, ш, р- зацвярдзелыя, яны вымаўляюцца заўсёды цвёрда. Пасля іх пішуцца галосныя а, о, у, э, ы.

**14. ПРАВАПІС Д – ДЗ'.**

Напішы слова правільна, запішы яшчэ 2 словы на гэта правіла, падкрэслі зычную разам з галоснай.

Рабі так: **Дзень, дзеці, адзіны.**

**Запомні!** У беларускай мове гук **[д]** заўсёды толькі цвёрды, а гук [дз']- мяккі. Пасля д пішуцца літары **а, о, у, ы, э,** пасля **дз'** – літары **я, ё, е, ю, і, ь**.

**15. ПРАВАПІС Т - Ц'.**

Напішы слова правільна, запішы яшчэ 2 словы на гэта правіла, падкрэслі зычную разам з галоснай.

Рабі так: **Ляцеў, цень, ціха.**

**Запомні!** У беларускай мове гук [т] заўсёды толькі цвёрды, а гук [ц']- мяккі. Пасля **т** пішуцца літары **а, о, у, ы, э,** пасля **ц'** – літары **я, ё, е, ю, і, ь**.

У беларусай мове ёсць і цвёрды гук [ц] : цэгла, цыбуля, цукар.

**16. ПАДОЎЖАНЫЯ ЗЫЧНЫЯ.**

Напішы слова правільна, падзяляючы яго для пераносу. Запішы яшчэ 2 слова на правіла.

Рабі так: **Гал-лё, на-сен-не, збож-жа.**

**Запомні!** Падоўжанае вымаўленне зычных **ж,з, л, н, ц, ч, ш** на пісьме перадаецца дзвюма літарамі. Падоўжанае **дз** на пісьме перадаецца спалучэннем літар **ддз**: суддзя.

**17. РАЗДЗЯЛЯЛЬНЫ ЗНАК АПОСТРАФ (').**

Напішы слова правільна, запішы яшчэ 2 словы на гэта правіла, падкрэслі літары, якія раздзяляюцца апострафам.

Рабі так: **Пер'е, вераб'і, сям'я.**

**Запомні!** У некаторых словах зычныя з галоснымі е,ё,і,ю,я вымаўляюцца раздзельна. На пісьме такое вымаўленне абазначаецца апострафам (').

**18. РАЗДЗЯЛЯЛЬНЫ МЯККІ ЗНАК.**

Напішы слова правільна, запішы яшчэ 2 словы на гэта правіла, падкрэслі ь і літару, якая стаіць перад ім.

Рабі так: **Залью, мільён, Ульяна**.

**Запомні!** Раздзяляльны мяккі знак пішацца пасля **л** перад галоснымі **е, ё, ю, я, і**.

**19. ПРЫНАЗОЎНІК.**

Напішы правільна прыназоўнік і слова, да якога ён адносіцца, паміж прыназоўнікам і словам устаў пытанне або іншае слова.

Рабі так: **У лес, у (які?) лес, у восеньскі лес.**

**Запомні!** Словы **у, на, за, са, да, на, з, пад, каля** - прыназоўнікі, якія са словамі пішуцца асобна.

**20. НЕ З ДЗЕЯСЛОВАМІ.**

Напішы правільна дзеяслоў і часціцу не. Запішы яшчэ 2 дзеясловы з часціцай не.

Рабі так: **Не чытала, не гаварыла, не шуміць.**

**Запомні!** Не з дзеясловамі пішацца асобна.

**21. АДНАРОДНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА.**

Напішы сказ правільна, падкрэслі патрэбныя знакі прыпынку. Запішы яшчэ 1 сказ.

Рабі так: **Людзі, жывёлы, расліны хварэюць. У пенале ляжыць аловак, ручка.**

**Запомні!** Члены саза, якія адказваюць на адно пытанне і звязаны па сэнсу з адным і тым жа словам, называюцца аднароднымі. На пісьме паміж аднароднымі членамі сказа ставіцца коска. Аднародныя члены сказа могуць быць звязаны злучнікамі. Перад злучнікамі **а, але** заўсёды ставіцца коска. Перад злучнікамі **і, ці, або,** калі яны ужываюцца адзін раз, коска не ставіцца.

**22. ПРАВАПІС КАНЧАТКАЎ НАЗОЎНІКАЎ.**

Напішы слова правільна, з дапамогай табліцы вызнач, чаму трэба пісаць такі канчатак. Запішы яшчэ 2 словы з такім канчаткам.

Рабі так:**Аб красуні (красуня–1-ае скл., М.скл, на мяккі зычны);аб прыгажуні.**

**Запомні!** Каб праверыць, які канчатак трэба напісаць, неабходна:

1. вызначыць скланенне і склон назоўніка;
2. вызначыць, на які зычны гук заканчваецца аснова слова (на **цвёрды**, **мяккі**, на **ж,ш,ч,дж,р,ц**, на **г, к, х**);
3. даведацца пра канчатак назоўніка па табліцы.

**23. ПРАВАПІС КАНЧАТКАЎ ПРЫМЕТНІКАЎ.**

Напішы слова правільна, з дапамогай табліцы вызнач, чаму трэба пісаць такі канчатак. Запішы яшчэ 2 словы з такім канчаткам.

Рабі так: **Асенняй (ночы) – ж.р., Д.скл, -яй, -ай, -ой; дарагой (матулі), цёплай.**

**Запомні!** Каб праверыць, які канчатак трэба напісаць, неабходна:

1. знайсці назоўнік, з якім звязаны гэты прыметнік;
2. вызначыць род, лік, склон назоўніка (прыметнік будзе мець такі ж род, лік, склон);
3. даведацца пра канчатак прыметніка па табліцы.

**24. ПРАВАПІС КАНЧАТКАЎ ДЗЕЯСЛОВАЎ.**

Напішы слова правільна, абазнач канчатак, утвары неазначальную форму дзеяслова, вызнач спражэнне. Запішы яшчэ 2 словы з такім канчаткам.

Рабі так: **Вяжуць – вязаць – І спр.; пішуць, спяваюць.**

**Запомні!** Каб правільна напісаць канчатак дзеяслова, трэба вызначыць яго спражэнне і даведацца пра канчатак дзеяслова па табліцы.

**25. 2-АЯ АСОБА ДЗЕЯСЛОВА.**

Напішы слова правільна, абазнач канчатак, запішы яшчэ 2 слова з такім канчаткам.

Рабі так: **Пішаш – 2-ая асоба, гаворыш, робіш.**

**Запомні!** Убеларускай мове канчаткі дзеясловаў 2-ой асобы **–аш, -еш, -эш, -іш, -ыш** пішуцца без мяккага знака.